**Рагуля А.У. (Мінск)**

# «Студні са слязамі…»
# (мастацкі канцэпт *душа* ў творчасці Максіма Багдановіча)

Абнаўленне мадэлі кагнітыўнага дзеяння ў беларускай культуры ХХ ст. пазначана вяртаннем на шлях гістарычнай творчасці вялікай душы і вялікага сэрца этнасу. У рацыяналізаваным да крайнасці гандлёвым грамадстве перамагла контрідэя, якая прызнае толькі тымчасовы інтарэс. Зацікаўленасць пытаннямі чалавечага самапазнання і самаўдасканалення ў сітуацыі поўнай залежнасці ад навязанай кан’юнктуры падаецца лішняй і непатрэбнай. Мефістофельская рэдукцыя сэнсаў чалавечага дзеяння ў цэлым стала апраўданнем пагарды да абвешчанага Ф. Скарынам прынцыпу «паспалітага добрага», прывяла да абясцэньвання духоўнасці. Сама душа стала як бы і непатрэбнай. Еўрапейская думка ў XIX–XX стст. настойліва імкнулася выйсці з-пад улады рэдуцыраваных сэнсаў. Гегель вывеў на шлях пошуку будучыні чалавечую душу ў абліччы абсалютнай ідэі – упершыню пасля Сакрата, Платона і Арыстоцеля. Інтуіцыя падказвала яго вялікаму розуму, што абсалютная ідэя складае адно цэлае з абсалютным духам, што ў бюргерскім соцыуме дабрыня не зможа дзейнічаць без апекі мужнага рыцара духу – «*духу непрыгоннага*», паводле Я. Купалы.

Энергія гегелеўскага філасофскага, так бы мовіць, абсалютызму атрымала свой працяг у інтуітывізме. Анры Бергсон у працах «Уводзіны ў метафізіку», «Творчая эвалюцыя» выказаўся за пераход кагнітыўнага дзеяння на іншыя шляхі, на якіх «развіліся іншыя формы свядомасці». Зблізіўшы інтэлект і інтуіцыю, французскі мысліцель настойліва сцвярджаў: «Мы, магчыма, атрымаем свядомасць, шырокую, як жыццё, і здольную на тое, каб раптоўна азірнуўшыся на свой жыццёвы парыў, убачыць яго цалкам, хоць бы на адно імгненне» [3, с. 4]. Жыццёвы парыў А. Бергсона – гэта гістарычны шлях спасціжэння сэнсаў гісторыі, тайны, як гаварыў Ф. Скарына ў прадмове да кнігі «Іоў», нашага жыцця на гэтым свеце.

Прадчуваючы надыход эпохі пост-Еўропы ў сусветнай гісторыі, інтэлігенцыя шукала адказ на пытанні: адкуль мы выйшлі, куды вядуць дарогі? Паспяховаму пошуку спрыяла мужная канцэпцыя катастрафізму, якая ў другой палове XIX ст. складвалася ў Чэхіі, Польшчы і Беларусі. На гэтым напрамку сфарміравалася новая філасофія суб’екта гісторыі. У Беларусі яе сутнасць адлюстравана ў канцэпцыі «крытычнага аптымізму» У. Самойлы. У Чэхіі Ян Патачка (1907–1977) сфарміраваў канцэпцыю філасофскага гераізму.

Строгая «безманерная манера» (А. Лойка) М. Багдановіча мае пераважна гарызантальную атрыбуцыю: паэт імкнуўся ажывіць культурную прастору забранага краю разнастайнымі формамі духоўнага жыццядзеяння. Устаноўка на мабілізацыю творчага патэнцыялу душы адчуваецца ў першым апублікаваным творы – апавяданні «Музыка», напісаным паводле фальклорных матываў. Галоўнымі яго персанажамі з’яўляюцца душа музыкі і сэрца бедакоў: «Ніхто не ведаў, што музыка ўсю душу сваю клаў у ігру. Душа яго знала ўсё тое гора, што бачыў ён па людзях, гэта гора грала на скрыпцы, гэта яно вадзіла смыкам па струнах, і ніводзін сыты не мог так граць, як грала народнае гора» [2, с. 7]. Азіраючыся на «жыццёвы парыў» беларускага этнасу, М. Багдановіч свядома

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

фарміраваў сваю душу, душу нацыянальнага інтэлігента, здольнага абудзіць энергію ўзвышэння ў супольнай душы этнасу.

Лічыцца, што наватарства паэта «з найбольшай выразнасцю праявілася ў фармальных пошуках паэтыкі» [4, с. 6]. Дазволім сабе з гэтым не пагадзіцца. У эпоху расхістаных форм і распыленых сэнсаў беларускі паэт якраз звяртаўся да ўстойлівых форм санета, рандо, трыялета, актавы, танку, пентаметра – браў са сваіх і чужых ніў тое, што спрыяе энтэлехіі, завершанасці сэнсаў, псіхічных комплексаў і дзеяздольнасці нацыянальнага стылю. Галоўным клопатам М. Багдановіча было пытанне імманенцыі, вернасці традыцыям непаказнога гераізму і мужнасці, уласцівым беларускаму рыцарству і сялянству.

Прывычка абмяжоўваць духоўны свет беларуса колам будзённых, побытавых інтарэсаў жыве і сёння. Беларускі даследчык доўга быў пазбаўлены магчымасці ўзысці на сцежку філасофскага гераізму Сакрата, Я. Гуса, Д. Бруна, К. Лышчынскага, К. Каліноўскага, каб выказаць «думы, путамі не скутыя». Інерцыя выказвання «напаўголаса» перашкаджае вербальнаму афармленню эстэтыкі беларускага мастацкага слова, якая ў ХХ ст. стала атрыбутыўнай уласцівасцю нацыянальнай культуры. М. Багдановіч свядома імкнуўся спалучыць вопыт эстэтыкі фенаменалагічнай, у аснове сваёй фальклорнай, і філасофскай, больш абстрагаванай, не забываючы пры гэтым пра сумарны духоўны вопыт «нашых дзедаў». Іх, таксама па інерцыі, называюць «вогнепаклоннікамі». Насамрэч жа яны былі ўладарамі вогненнай стыхіі. *Паклоннік* – чужое ў беларускай мове слова, варварызм. М. Багдановіч добра ведаў, на якія ўзоры трэба раўняцца: «І пылалі па нашаму краю лясы, / Покуль сонца здалела ўсё ў ім асвяціць; / І святлей і прасторней тады стала жыць, / А на попеле буйна ўзраслі каласы. / З гэтых дзедаў суворых прыклад нам бы ўзяць, – / Не хіліцца з бяды, не пужацца агня, / Бо мы толькі тады дачакаемся дня, / Калі нас не здалее змаганне злякаць» [1, с. 113].

Мастацкія прыёмы М. Багдановіча нагадваюць тэхналогію пошукавай працы археолага. Паэт вяртае ў актуальнае жыццё культурныя феномены, якія пасля іх паэтычнай апрацоўкі лечаць і цешаць душу ў цемры сучаснай цывілізацыі мяккім святлом кітайскага ліхтарыка ці някідкай вясёлкі вакол месяца. Так раскрываюцца новыя значэнні і сэнсы «Пагоні», слуцкіх паясоў, паданняў пра Усяслава Полацкага... Так раскрываюцца першапачатковыя гераічныя сэнсы беларускага палімпсесту, сфарміраваныя этнасам у часы родавай і тэрытарыяльнай (суседскай) грамады. На глебе гераічнага псіхічнага комплексу ўзнікла гераічная і велічная ў сваёй «суворай» прастаце канцэпцыя літвінізму – візітная картка беларускай душы ў часы яе найбольш актыўнага ўдзелу ў тварэнні гістарычнага лёсу Еўропы.

М. Багдановіч свядома адмяжоўваўся ад авангардысцкага нігілізму, але праблему традыцый і народнасці ставіў і вырашаў па-наватарску, бо глыбока ўсведамляў пагрозу духоўнай змены этнасу ў спрошчаным разуменні народнасці, у стылізацыі пад народнасць, у безаглядней прымітывізацыі. Ён настойліва шукаў шлях да інтэграцыі здабыткаў беларускага класічнага фальклору і класічнага рэалізму, да сінтэзу ў нацыянальным культурным працэсе сумарнага сэнсу культурагенезу ва ўсёй яго магчымай паўнаце. Адгэтуль ідзе і яго засяроджанасць на пытаннях мастацкай фарматызацыі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

новых, абагульненых значэнняў чалавечага існавання. М. Багдановіч бачыў сваё прызначэнне ў завяршэнні і афармленні працэсу рэфармацыі беларускай сацыякультурнай дынамікі, пачынальнікамі якога былі К. Каліноўскі і Ф. Багушэвіч. Максім Кніжнік фарміраваў беларускі *мінімалізм* – стыль максімальнай канцэнтрацыі духоўнага зместу ў мікраманадах вобразнай структуры. Гэтым самым увесь творчы працэс, з улікам рэцэпцыі, успрымання і лірыка-суб'ектыўнага перажывання, пераносіўся ў поле філасофскага асэнсавання чалавечай сутнасці. Мінімалізм у XX ст. быў дзейснай альтэрнатывай афіцыёзнаму пустаслоўю і гігантаманіі.

Беларускі адраджэнскі рух XX ст. разгортваўся пад сцягам новай рэфармацыі, заснаванай на ніве рэальнай этыкі і панэстэтызму, арыентаваных на чыстую людскасць. Патэнстэтызм у выглядзе светапогляднай сістэмы быў аформлены В. Ластоўскім і М. Багдановічам. І. Канчэўскі («Адвечным шляхам») абазначыў першапачатковую ўмову самарэалізацыі этнасу – шлях да свабоднай кааперацыі ўласных творчых рэсурсаў, інакш – кансалідацыі патрыятычнай інтэлігенцыі.

Светапоглядныя арыентацыі М. Багдановіча і І. Канчэўскага амаль тоесныя, як і іх трагічны лёс. Усё існае – творчае – такім быў дэвіз І. Канчэўскага, прыхільніка няспынна рухомай формы. М. Багдановіч дапаўняў гэтую канцэпцыю клопатам пра фарматызацыю і крышталізацыю душы ў эпоху безагляднага эксперыментатарства і міжвольнага рэнегацтва. Гэтым самым ён акумуляваў энергію душы для новага жыццёвага парыву – *выйсця* ў новую прастору духоўнага і сацыяльнага жыццядзеяння: «Мая душа, як ястраб дзікі, / Што рвецца ў неба на прастор, / Вартуе вольных птушак крыкі, – / Мая душа, як ястраб дзікі. / Учуўшы іх, страшне вялікі / Свой сон, шыбне ды вышай гор, – / Мая душа, як ястраб дзікі, / Што рвецца ў неба на прастор!» [1, с. 223]. Трыялет М. Багдановіча можа быць узорам развіцця і ўдасканалення фальклорнага семіёзісу. У яго мініяцюрнай форме выразна бачацца ўсе стадыі семіятычнага працэсу: з'яўленне – пераадоленне (пераплаўка) – выйсце (узлёт). Перанастройка душы выразна адчуваецца ў маштабах дзеяння арганічна з'яднаных у адно цэлае інтэлекту і інтуіцыі. Так нараджаецца нанова *дух непрыгоннага*, які ў паэзіі М. Багдановіча выступае ў якасці суб'екта рэалістычнай філасофіі жыцця.

У вырашэнні кардынальнай анталагічнай праблемы беларускі паэт разыходзіўся не толькі з кінікамі новай фармацыі на Захадзе, але і з містыкамі і метафізікамі «срэбранага веку» ў Расіі – К. Бальмонтам, Д. Меражкоўскім. Пытанні «хто вінаваты?» і «дзеля чаго існуе сусвет?» яго займалі менш, чым праблемы чалавечай раз'яднанасці і адсутнасці ўзаемаразумення: «Хто мы такія? / Толькі падарожныя, – папутнікі сярод нябёс. / Нашто ж на зямлі / Сваркі і звадкі, боль і горыч, / Калі ўсе мы разам ляцім / Да зор?» [1, с. 278].

У другой палове XX ст. традыцыя мужнага філасофскага спасціжэння Ісціны і праўды веку перарасла ў кірунак, названы суровым стылем. На гэтым кірунку здзейснены важнейшыя інтэлектуальныя і мастацка-эстэтычныя адкрыцці беларускай лірыкі і прозы.

**Літаратура**

1. Багдановіч, М. Поўны збор твораў : у 3 т / М. Багдановіч. – Мінск, 1992–1995. – Т. 1 : Вершы, паэмы, пераклады, наследаванні, чарнавыя накіды. – 1992.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

2. Багдановіч, М. Поўны збор твораў : у 3 т. / М. Багдановіч. – Мінск, 1992–1995. – Т. 2 : Маст. проза, пераклады, літаратурныя артыкулы, рэцэнзіі і нататкі, чарнавыя накіды. – 1993.

Бергсон, А. Творческая эволюция / А. Бергсон // Собр. соч. – СПб., 1914. – Т. 1.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ